З каталіцкіх СМІ Беларусі (16)

Аўтар: Рэдакцыя
11.07.2021 00:00

Ігнацыянская духоўнасць перажыла выпрабаванне часам і прынесла вялікі духоўны плён у жыцці многіх пакаленняў вернікаў. Прапануем пяць крокаў штодзённага рахунку сумлення паводле метаду св. Ігнацыя Лаёлы:

1. Падзякаваць: узгадаць усё добрае, што было на працягу дня, нават калі ён быў вельмі цяжкім.
2. Папрасіць святла: пастарацца паглядзець на свой дзень вачыма добрага Бога, які жадае дапамагчы.
3. Паўтарыць свой дзень: пастарацца прыгадаць усе моманты дня і заўважыць, што ўздымала мяне ўгору, а што апускала ўніз.
4. Папрасіць прабачэння ў Бога: шчыра прызнаць усё тое, што раніла мяне і іншых.
5. Паабяцаць зрабіць крок наперад з дапамогай Яго ласкі: запытацца ў Езуса, што магу зрабіць у жыцці лепш. †

Св. Брыгіта пачула ў адным з аб'яўленняў, што той, хто хоча прыпадобніцца да Езуса і яднацца з Ім на працягу ўсяго жыцця, павінен часта спавядацца, прычым не толькі з грахоў, але таксама з недасканаласцей. Вернікі, якія рэгулярна прыступаюць да сакраманту споведзі, ведаюць, што Хрыстос праз паслугу святара не толькі адпускае грахі ды дапамагае духоўна расці, але і напаўняе чалавечую асобу сваёю прысутнасцю, якая набліжае да Бога – Крыніцы ўсялякай святасці.

З біяграфій святых можам даведацца, наколькі важнай для іх была споведзь і як часта яны спавядаліся. Калі хтосьці дайшоў да з'яднання з Богам праз любоў, споведзь становіцца для яго спосабам камуніі з Богам і матывуецца не грахамі, а набожнасцю.

З каталіцкіх СМІ Беларусі (16)

Аўтар: Рэдакцыя
11.07.2021 00:00